*Я. Р. САМУЙЛІК*

# НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ГАВОРАК ВЫГАНАЎСКАГА ПАЛЕССЯ

Выганаўскае Палессе ахоплівае міжрэчча Ясельды і Шчары, а таксама невялікую частку басейна р. Шчары ў яе верхнім цячэнні. У яго межах знаходзіцца Выганаўскае, або Выганашчанскае, возера (плошча 26 км$^2$). Адміністрацыйна гэта — паўднёвая частка Івацэвіцкага раёна (Целяханшчына) і прылягаючыя тэрыторыі Ляхавіцкага, Ганцавіцкага, Лунінецкага, Пінскага і Бярозаўскага раёнаў Брэсцкай вобласці. Выганаўскае Палессе размешчана пераважна ў Заходнім Палессі, у паўночнай яго частцы, на мяжы з Панямоннем. Гістарычна яно займае як бы прамежкавае становішча паміж «тыповым» Заходнім Палессем і Панямоннем, а ў этнаграфічным аспекце з'яўляецца месцам «сутыкнення» чатырох буйных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі: Паўночна-Заходняга, або Панямоння, Цэнтральнага рэгіёна, Усходняга Палесся і Заходняга Палесся.

У навуковай літаратуры пры характарыстыцы гаворак гэты рэгіён часцей за ўсё паказваецца як сумежжа больш буйных дыялектных масіваў — панямонскага і заходнепалескага [1]. Пытанні дыялектнай сітуацыі на яго тэрыторыі даследаваліся мала. Так, Н. Т. Вайтовіч выдзеліла паўночнабрэсцкія гаворкі, у склад якіх была ўключана і асноўная частка гаворак Выганаўскага Палесся [2]. Ф. Д. Клімчук удакладніў межы паўночнабрэсцкіх гаворак, адзначыў некаторыя асаблівасці, якія іх дыферэнцыруюць, а таксама на падставе фанетычных рыс выдзеліў больш дробныя адзінкі—паўднёвацеляханскія і паўночналагішынскія гаворкі [3].

Такім чынам, агульны малюнак дыялектнага ландшафту Выганаўскага Палесся, паводле названых вышэй прац, наступны (рыс. № 1). На крайняй поўначы рэгіёна пашыраны панямонскія (гродзенска-баранавіцкія) гаворкі. Асноўную частку Выганаўскага Палесся займаюць гаворкі паўночнабрэсцкія. Далей на поўдзень знаходзяцца паўднёвацеляханскія і паўночналагішынскія гаворкі, пераходныя паміж паўночнабрэсцкімі і загародскімі. Нарэшце, на крайнім поўдні рэгіёна пашыраны загародскія або тыповыя брэсцка-пінскія гаворкі.

Улічваючы тыя факты, што Выганаўскае Палессе — рэгіён надзвычай цікавы і да гэтага часу ў навуковай літаратуры адносна яго дыялектных асаблівасцей ёсць фрагментарныя і даволі супярэчлівыя звесткі, было вырашана даследаваць яго больш глыбока і дэталёва лінгвагеаграфічным метадам, г. зн. скласці рэгіянальны Дыялектны атлас Выганаўскага Палесся (ДАВП).

---

[1] Нарысы па беларускай дыялекталогіі. Мн., 1964. С. 402; Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак. Мн., 1969. Карта 71; Блінава Э. Д., Мяцельская Е. С. Беларуская дыялекталогія. Мн., 1980.

[2] Вайтовіч Н. Т. Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі. Мн., 1968. С. 81—82, 107—108, 113, 189.

[3] Клімчук Ф. Д. Гаворкі Заходняга Палесся: Фанетычны нарыс. Мн., 1983. С. 7—12, 38—39.

4. Зак. 1315

Першапачаткова складзена Праграма па збіранню звестак для атласа, якая налічвае 117 пытанняў, з іх 38 — фанетычных, 33 — марфалагічных і 46 лексічных. Сетка атласа складаецца з дзвюх частак: асноўнай (26 нас. пунктаў) і дадатковай (8 нас. пунктаў). Асноўная сетка ўключае амаль усе паўночнабрэсцкія гаворкі, якія знаходзяцца ў межах Івацэвіцкага і заходняй часткі Ганцавіцкага раёнаў Брэсцкай вобласці, у тым ліку гаворкі г. п. Целяханы, а таксама вв. Вяда [4] і Тупічычы, знішчаных




Рыс. 1. Гаворкі Выганаўскага Палесся і наваколляў паводле папярэдніх даследаванняў: 1 — гродзенска-баранавіцкія (панямонскія); 2 — паўночнабрэсцкія; 3 — паўднёва-целяханскія; 4 — паўночналагішынскія; 5 — загародскія; — — — межы гаворак

нямецка-фашысцкімі захопнікамі разам з жыхарамі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Запісы гаворкі жыхароў вв. Вяда і Тупічычы зроблены ад інфарматараў, што цудам засталіся жывымі і зараз жывуць у г. п. Целяханы. У дадатковую сетку ўключаны асобныя гаворкі суседніх з Выганаўскім Палессем рэгіёнаў: в. Панкі Івацэвіцкага, в. Қарацк Қлецкага, в. Першамайская Бярозаўскага, в. Ушкавіца Қобрынскага, вв. Субаты і Сіманавічы Драгічынскага, в. Рухча Столінскага і в. Пагост Жыткавіцкага раёнаў. Такім чынам, усяго ў ДАВП змешчаны звесткі з 34 нас. пунктаў [5].

[4] Вёска Вяда ўпершыню ўпамінаецца ў пісьмовых помніках у 1433 г.

[5] Гаворкі 27 нас. пунктаў абследаваны аўтарам, астатнія 7 абследавалі: М. М. Аляхновіч (№ 25), В. Л. Вярэніч (№ 33), Ф. Д. Клімчук (№ 31, 32), Т. В. Кузьмянкова (№ 28), П. А. Міхайлаў (№ 30), М. А. Саскевіч (№ 34).

Назіраецца дыферэнцыяцыя гаворак Выганаўскага Палесся і па характару вымаўлення зычнага *в*<*в*, *л* у пазіцыі пасля галосных (карта № 41, рыс. 3). У большасці паўночнабрэсцкіх, паўднёвацеляханскіх і паўночналагішынскіх гаворак вымаўляецца губна-губны зычны w: *пра́wда, до́wг'і, куп'іw, ла́wка.* Часам у гэтых гаворках у дадзенай пазіцыі можна пачуць паўгалосны *ў*, напрыклад, пры вымаўленні слова *авёс*: *оўйо́с* (карта № 9). У панямонскіх, даследуемых верхнясельдскай і тураўскай, некаторых паўночнабрэсцкіх (вв. Тупічычы і Раздзялавічы) у




Рыс. 2. Рэалізацыя зычных *д* і *т* перад рэфлексамі *і*: 1 — *дз, ц* палатальныя: *хадз''іц''*, *ц''іхо*; 2 — *дз, ц* палаталізаваныя: *ходз'іц'і, ц'іхо*; 3 — мяккія *дз, ц* спарадычна; 4 — мяккія *д(з), т(ц)* спарадычна: *ход(з)'іт(ц)'і;* 5 — мяккія *д, т*: *ход'іт'і, т'іхо*; 6 — тое ж спарадычна; 7 — цвёрдыя *д, т: ходыты, тыхо*

гэтай пазіцыі вымаўляецца паўгалосны *ў,* а ў большасці загародскіх гаворак — губна-зубны *v*.

З марфалагічных асаблівасцей гаворак Выганаўскага Палесся разгледзім толькі адну. У большасці з іх, а іменна ў паўночнабрэсцкіх, паўднёвацеляханскіх, паўночналагішынскіх, значнай частцы загародскіх, у даследуемай верхнясельдскай назоўнікі ж. р. мн. л. у Р. скл. маюць канчатак *-ей*: *бабе́й, баб'е́й, хате́й, стрехе́й, дороге́й, го́ловей, йаме́й* (карта № 59). У панямонскіх, загародскіх (іх заходняя частка) і даследуемай тураўскай гаворках гэтыя назоўнікі ў Р. скл. мн. л. ужываюцца або без канчаткаў (*баб, хат, стрэх* і інш.), або з канчаткамі *-аў, -оў, -ів* (*бабо́ў, ба́баў, ха́таў, баб'ів, хаты́в*).

Спынімся на некаторых лексічных асаблівасцях гаворак Выганаўскага Палесся. У большасці з іх (паўночнабрэсцкія, паўднёвацеляханскія, прылягаючыя да іх панямонскія — в. Гічыцы, паўночналагішынскія — в. Рэчкі, загародскія — в. Сакалоўка) у значэнні 'воблака' ужываецца слова *перéхмарок* (нярэдка паралельна з іншымі назвамі); у тураўскай гаворцы в. Пагост у гэтым значэнні ўжываецца слова *пóхмарок*, у астатніх даследуемых гаворках — словы *óболок, вóблако, óблако, óблак* (карта № 87).




Рыс. 3. Рэфлексы зычнага *в*<*в*, *л* пасля галосных: 1 — паўгалосны *ў*: *праўда, доўгі, купіў*; 2 — тое ж спарадычна; 3 — губна-губны зычны *ѡ*: *праѡда, доѡгі, купіѡ*; 4 — губна-зубны зычны *v*: *праvда, доvгый, купыv*

У якасці агульнай назвы неядомых грыбоў у большасці даследуемых паўночнабрэсцкіх, паўднёвацеляханскіх, прылягаючых да іх паўночналагішынскіх (в. Рэчкі) і загародскіх (в. Сакалоўка) гаворак ужываецца слова *овéчыйе — ов'éчыйе*, часта паралельна са словам *вóўчыйе (вóвчыйе)*, радзей са словамі *пол'аныйе, пол'евыйе*. У астатніх даследуемых гаворках неядомыя грыбы называюць *вóўчыйа* (*вóўчыйе, вóвчыйе, вóвчы*), у гаворцы в. Ушкавіца Кобрынскага раёна — *ж'áбс'кы* (карта № 93).

На асноўнай частцы тэрыторыі Выганаўскага Палесся ў значэнні 'драбіны' пашыраны тры назвы: *страм'íна, драб'íна* і *страб'íна* (карта № 113). Назва *страб'íна*, відавочна, з'яўляецца вынікам кантамінацыі

назваў *страм'іна* і *драб'іна.* У панямонскіх, прылягаючых да іх паўночнабрэсцкіх, у верхняясельдскай (Першамайская) і тураўскай (Пагост) гаворках зафіксаваны назвы *драб'іна, драб'іны,* у загародскіх гаворках — *страмы́на,* а ў заходняй іх частцы — *рабры́на.*

Мы паказалі толькі некаторыя асаблівасці гаворак Выганаўскага Палесся, якія супрацьпастаўляюць гэту тэрыторыю гаворкам суседніх рэгіёнаў. Наяўнасць такога супрацьпастаўлення дае падставы гаварыць аб існаванні (выдзяленні) целяханскай групы або падгрупы ў сістэме паўночнабрэсцкіх гаворак, а таксама аб выганаўскай ці паўднёвавыганаўскай дыялектнай мікразоне, якая аб'ядноўвае паўночнабрэсцкія, паўднёвацеляханскія і паўночналагішынскія гаворкі Выганаўскага Палесся.

Карты Дыялектнага атласа Выганаўскага Палесся адлюстроўваюць таксама суадносіны гаворак гэтай тэрыторыі з гаворкамі суседніх рэгіёнаў. Аднак гэта асобная праблема для спецыяльных даследаванняў.

У заключэнне для больш поўнага ўяўлення аб гаворках Выганаўскага Палесся прывядзём невялічкі расказ былой жыхаркі в. Вяда Івацэвіцкага раёна (мясц. Вйадо) Алены Андрэеўны Куратнік, 1904 г. нар., аб трагедыі яе роднай вёскі і жыхароў у час фашысцкай акупацыі.

Нашэ село бы$^{у}$ло хвайнэе. До войны вэльмі вэсело жылі. А цепэр німа села. Роскажу, як гэто бы$^{у}$ло. Прышлі немцы. Загналі всех до возера. Тут немцы сталі одбіраць по дзесець-дванаццаць чоловек і водзіць у корчэ до возера. Там мы чулі, як воны (немцы) стрэлялі. Вэльмі жалко бы$^{у}$ло молодых дзевчат. Колі там у корчах немцы стрэлялі, то молодые дзевчаткі рвалі на голове косы. Воны ж зналі, што з імі тэе ж самэе будзе... Повэлі і нас чоловек одзінаццаць. Завэлі в корчэ. Наставілі автоматы. Я думала, шчо вжэ всё. Больш жыці не буду. Але мэне толькі ранілі. І на мэне хто-то впав. Я заплюшчыла вочы. Не ведаю, довго чы не довго лежала. Потом чую, шо хто-то пройшов і опэкло плечо. Шчэ раз мэне ранілі. Мусіць, немэц добівав пораненых. Кэлькі я лежала, не ведаю. Прочнуласа пэзно, ужэ ноччу. Ціхэнько выбраласа. Шо робілосо! Божэ мэй! Село догорало. В жывых бы$^{у}$лі шчэ пару чоловек. Жывы бы$^{у}$в і мэй брат, які работае зарэ в Ляховіцкім раёне агрономом. Потом бы$^{у}$ла в парцізанскіх лагерах. После войны жыву в Целеханах.

Спіс населеных пунктаў: 1. Гічыцы, 2. Жытлін, 3. Вулька Аброўская, 4. Козікі, 5. Вяда, 6. Тупічычы, 7. Бабровічы, 8. Выганашчы, 9. Раздзялавічы, 10. Вялікая Гаць, 11. Малая Гаць, 12. Святая Воля, 13. Доўгая, 14. Целяханы, 15. Вулька Целяханская, 16. Соміна, 17. Турная, 18. Горталь, 19. Гутка, 20. Краі, 21. Гошча, 22. Азарычы, 23. Рэчкі, 24. Сакалоўка, 25. Валішча, 26. Трасцянка, 27. Панкі, 28. Карацк, 29. Першамайская, 30. Ушкавіца, 31. Субаты, 32. Сіманавічы, 33. Рухча, 34. Пагост.

*Целяханы*